2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. Акапэла – Куцця. – 768 с.

3. Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / уклад., прадм. і перакл. У. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – 607 с.

РЕЗЮМЕ

В статье охарактеризованы отдельные обрядовые этапы досвадебного и собственно свадебного периодов, а также выявлены отличительные местные особенности послесвадебной части, что нашло подтверждение в этнографических описаниях информантов.

Внимание сосредоточено также на народных верованиях, характерных для разных обрядовых этапов. Приведены интересные примеры примет и поверий, содержание которых позволяет осмыслить глубину и поэтичность восприятия предками окружающей среды. Научную ценность представляют фольклорно-этнографические материалы, которые впервые вводятся в научный оборот.

SUMMARY

The article focuses on the ceremonial stages of the pre-wedding and the wedding periodand it shows the local peculiarities of the post-wedding part that has been proved by the vivid ethnographic descriptions provided by the informants.

Attention is focused on folk beliefs connected with different ritual stages and reflected in omens and beliefs, the content of which helps us to understand the depth and poetry of our ancestors' world outlook. Scientific value is connected with the folklore and ethnographic materials, which are introduced in a scientific way for the first time.

***Паборцава К. В.***

# МІФАЛАГІЧНАЯ ПРОЗА ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА НАРОДНЫХ ВЕРАВАННЯЎ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.2022)*

У сістэме сучаснай духоўнай культуры беларусаў, у тым ліку жыхароў Гомельшчыны, важнае месца займаюць народныя вераванні, звязаныя з вобразамі народнай дэманалогіі. Мэта артыкула – выявіць лакальную спецыфіку бытавання міфалагічных апавяданняў пра персанажы ніжэйшай міфалогіі ў народнай памяці жыхароў Веткаўскага раёна. Аб'ектам вывучэння з'яўляюцца тэксты міфалагічнай прозы (апублікаваныя і архіўныя), запісаныя на тэрыторыі Веткаўскага раёна. Прадмет даследавання складаюць семантыка вобразаў ніжэйшага міфалагічнага ўзроўню і звязаныя з імі матывы, мікраматывы, а таксама рэгіянальна-лакальныя асаблівасці праявы народных вераванняў. Методыка даследавання вызначаецца

рэгіянальным падыходам, што дазваляе глыбока вывучыць міфалагічную традыцыю асобнай мясцовасці. Фундаментальнае чатырохтомнае выданне «Народная демонология Полесья», укладальнікамі якога з’яўляюцца Л. М. Вінаградава і А. Я. Леўкіеўская, – адна з асноўных метадалагічных прац, надзвычай карысных для даследавання міфалагічнай прозы беларусаў. Паводле слушнай заўвагі акадэміка Расійскай акадэміі навук С. М. Талстой, публікацыя поўнага корпусу матэрыялаў па народнай дэманалогіі Палесся не толькі дае даследчыкам у распараджэнне вялікі новы палявы матэрыял аднаго з найбольш архаічных рэгіёнаў славянскага свету і дазваляе ацаніць палескую традыцыю ў агульнаславянскай перспектыве, але і дае магчымасць працягнуць яе вывучэнне [1, с. 60]. У гэтых адносінах прапанаванае даследаванне набывае актуальнасць у сувязі з праблемай рэгіянальна-лакальнай характарыстыкі персанажа ўніжэйшай міфалогіі, кожны з якіх «мае свой устойлівы набор рэлевантных матываў, замацаваных у традыцыі. Гэты набор матываў з’яўляецца алгарытмам апісання персанажа» [2, с. 7 – 8].

Сярод духаў хатняй прасторы ўстойлівасцю бытавання вылучаюцца міфалагічныя тэксты пра дамавіка, зафіксаваныя ў вёсках Старое Сяло, Куты, Неглюбка, Новы Мір, Прысно, Старыя Грамыкі, Хальч, Чамярня, Шэйка і іншых, а таксама ў горадзе Ветка. Аналітычную характарыстыку дадзенага персанажа варта пачаць з апісання яго знешняга выгляду ў розных лакальных традыцыях. Абапіраючыся на вылучаную А. Я. Леўкіеўскай групу матываў, звязаных з дамавіком, у прыватнасці з апісаннем яго знешняга выгляду, выкажам меркаванне, што найбольш папулярнымі з’яўляюцца наступныя: «Дамавік нябачны»; «Дамавік мае выгляд чалавека (мужчыны, старога»); «Дамавік мае выгляд жывёлы (сабакі, ката)» [2, с. 32]. Як вынікае з папярэдне праведзенай сістэматызацыі фактычных матэрыялаў, дамавік можа з’яўляцца ў дзвюх іпастасях: антрапаморфнай і зааморфнай. Што да чалавечага аблічча гэтай істоты, то ў мясцовых запісах сустракаюцца варыянты, калі дамавік мог з’явіцца ў выглядзе дзеда (*«Быў тут дзед, малы, барадаты, смешны і забаўляў мяне, шчыкаціў»* – зап. у г. Ветка)[1], высокага мужчыны (*«Маці мне казала, што дамавік высокі такі дзядзька»* – зап. ад Н. В. Валісавай, 1969 г. н., у в. Прысно), казачнага персанажа гнома (*«Ета такі маленькі чалавек, як гном, у яго дужа вялікая сівая барада і такія ж валасы»* – зап. у в. Чамярня ад Марыі Піліпаўны Грамыка, 1933 г. н., пражывала ў в. Новыя Грамыкі). У другой групе міфалагічных апавяданняў перавага аддаецца

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

зааморфнаму вобразу дамавіка (з’яўляецца ў аблічны ката): *«Во, у вёсцы казалі, што раз да адной нашай жэншчыны кот шэры прыбег ды давай каля яе лашчыцца. Гаспадыня яго пашкадавала, добра накарміла, думала, што ён яшчэ прыбяжыць, але ён з таго часу больш не паказваўся. Казалі, што сам хатнік прыходзіў, хацеў сваіх гаспадароў праверыць»* (зап. ад Івана Дзмітрыевіча Рослікава, 1930 г. н., у в. Шэйка,); *«Шчэ старыя ў нас казалі, што калі бачыш часта на панадворку ката ці сабаку незвычайных, галоўнае нічыйных, то, значыць, сам дамавік паказаўся»* (зап. ад Ганны Іванаўны Казіміравай, 1937 г. н., у в. Старыя Грамыкі).

У пераважнай большасці мясцовых міфалагічных тэкстаў гаворыцца аб тым, што дамавік – нябачная істота. Як слушна сцвярджае А. Я. Леўкіеўская, «для палескіх уяўленняў, як і ўвогуле для ўяўленняў пра любы міфалагічны персанаж, характэрна ўніверсальная дыхатамія бачнасці/нябачнасці дамавіка: прынцыпова ён нябачны, але пры гэтым мае пэўнае аблічча» [2, с. 27]. Фактычны матэрыял з’яўляецца пацвярджэннем меркавання даследчыцы, штоз аднаго боку, дамавік – *«ета нявідзімае сушчаство, якое находзіцца ў кожным доме»* (зап. ад Ганны Іванаўны Герасіменка, 1934 г. н., у в. Неглюбка), а з другога – *«быў ён малады, прыгожы, светлавалосы і апрануты быў у светлую кофту і цёмныя штаны»* (зап. ад Людмілы Міхайлаўны Котавай, 1963 г. н., у в. Хальч).

З матывам «Месца жыхарства дамавіка і час яго праявы» звязана найбольшая колькасць варыянтаў міфалагічных тэкстаў. У гэтай групе вылучаецца актыўнасцю бытавання мікраматыў «Дамавік жыве ў доме», пры гэтым удакладняецца і ў многіх тэкстах пацвярджаецца, што гэтая істота знаходзіцца ў кожным доме: *«Дамавік доўжан быць у кожнай хаце, кварціры, калі толькі засяліліся»* (зап. у г. Гомель ад Леаніда Іванавіча Гусакова, 1967 г. н., пражываў у в. Акшынка Веткаўскага р-на); *«Дамавікі бываюць у кожным доме, а калі чым не ўгаварыў, то не спрыяе, а сердзіцца і неспакойна сябе вядзе, як пастаронні»* (зап. ад Н. В. Валісавай у в. Прысно). Вышэйназваны матыў, звязаны з пражываннем дамавіка ў хаце, зыходзячы з веткаўскай калекцыі запісаў, канкрэтызуецца ў мікраматывах «Дамавік жыве ў хаце пад печчу» (*«Жыве ён у хаце найчасцей пад печчу, стараецца дапамагаць гаспадарам сваім»* – зап. у в. Чамярня ад М. П. Грамыка) і «Дамавік жыве ў хаце ў куце» (*«Дамавік жыве ў хаце ў тым вуглу, дзе стаіць венік»* – зап. ад Ніны Канстанцінаўны Рослікавай, 1930 г. н., у в. Шэйка). У адным з варыянтаў знайшлі адлюстраванне два вышэйназваныя мікраматывы, праўда, замест месца «пад печчу» прыводзіцца «прыпечак»:

*«Жывуць аны як у сваім домі, дык на прыпечку, а як у кварціры, дык, наверна, ета я так думаю, у куце»* (зап. ад Л. І. Гусакова ў г. Гомель).

Матыў, звязаны з дзеяннямі дамавіка ў адносінах да чалавека і яго гаспадаркі, выяўляецца ў шэрагу мікраматываў, сярод якіх можна вылучыць: «Дамавік дапамагае, калі любіць гаспадароў»; «Дамавік шкодзіць, калі не любіць чалавека»; «Дамавік помсціць чалавеку за крыўду»; «Дамавік прадказвае, што чалавека чакае ў будучым» і іншыя. Паводле сведчанняў жыхароў Веткаўшчыны, з дамавіком трэба жыць у згодзе, тады і ён будзе дапамагаць гаспадарам: *«Дамавік быў харошы чалавек <...> У каго ў доме жыве, яго абярагалі, клалі на шулу есці, гаварылі, што вось у мяне дамавік жыве»* (зап. ад Л. В. Зайцавай, 1938 г. н., у в. Прысно); *«Дамавіка нада паважаць, каб сабе бяды не нарабіць»* (зап. ад Валянціны Іванаўны Кавалёвай, 1946 г. н., у в. Старое Сяло). У народзе асцерагаліся дамавіка: *«Калі яго абідзіш, ён можа разгневацца. Ён можа абідзіцца і прынясці бяду ў дом»* (зап. ад Г. І. Герасіменка ў в. Неглюбка).

Дамавік шкодзіць тады, калі гаспадары не вераць, што ён жыве ў хаце іпра яго прамаўляюць дрэнныя словы (*«Некаторыя людзі не вераць, што дамавік ёсць. А той на іх зліцца і розныя непрыемнасці ім робіць. А шчэ дамавік не любіць, калі яго нядобрым словам памінаюць»* (зап. ад В. І. Кавалёвай у в. Старое Сяло). Іншы раз дамавік шкодзіць, калі раптам неўзлюбіў чалавека: *«Дамавік быў тут, у Надзі. Так вот, увечары яна ўбірае пасуду, прыбярэць, паставіць і лажыцца спаць. І тая пасуда ўся ходарам ходзіць – пабілася тая пасуда. Яна ўжо пайшла бабкам гаварыць, а яны гаворадь: "Дамавік цябе не ўлюбіў у доме"»* [3, с. 324].

Сярод фактычных матэрыялаў выяўлены толькі адзін міфалагічны тэкст з мікраматывам пра прадказанне дамавіком будучыні: «*А яшчэ дамавы можа будучае прадказваць. Калі шчэ дзеўкай была, дык варажыла, як мама вучыла. На вялікае свята запаліла свечку прыхаваную і сказала такія словы:*

*Бацька-дамавы, хатнік дарагі,*
*На мяне ты не гнявіся,*
*Судзьбу маю пакажы,*
*Долю прадкажы.*

*Калі свечка затухала, то, значыць, нешчаслівая будзеш, а калі будзе гарэць, то будзе ўсё, як у людзей*» (зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня).

На Веткаўшчыне матыў «Абярэгі ад дамавіка» рэалізуецца ў такім мікраматыве, як «Асвячэнне хаты»: *«А ваабшчэ разныя дамавыя бываюць. Ані могут дзелаць зло людзям, падкідвают клубкі валос, а то і іголкі могут.*

*Усё на зло. Дык нада свяціць хату пасвячонай вадой, ані етага баяцца»* (зап. ад Л. І. Гусакова ў г. Гомель).

Сярод духаў прыроднай прасторы вылучаецца міфалагічны персанаж вадзянік. Заслугоўвае ўвагі заўвага, выказаная А. Я. Леўкіеўскай адносна гэтай істоты: «Паколькі персанаж палескай міфалагічнай сістэмы, які жыве ў вадзе і варожы чалавеку, паводле рада прынцыповых характарыстык адрозніваецца ад рускіх уяўленняў пра *вадзяніка*, у дадзенай главе, каб пазбегнуць ілжывых асацыяцый, ён называецца *вадзяным духам*» [3, с. 299]. Зыходзячы з абазначаныхдаследчыцайматываў міфалагічных тэкстаў пра гэты персанаж («Персанаж, які жыве ў вадаёме», «Знешні выгляд вадзянога духа», «Дзеянні вадзянога духа ў адносінах да чалавека», «Дзеянні чалавека ў адносінах да вадзянога духа»» [3, с. 304 – 305]), паспрабуем выявіць на невялікім фактычным матэрыяле, запісаным у Веткаўскім раёне, тыя з іх, якія геаграфічна лакалізаваны менавіта тут. У некалькіх тэкстах адлюстраваны матыў, звязаны з пражываннем вадзянога духа ў вадзе, пры гэтым у адной з прымхліц выразна адлюстраваны мікраматыў, звязаны з чалавекам-тапельнікам: *«Вадзяныя могуць жыць у любой вадзе»* (зап. ад Аляксандры Анатольеўны Азарушкінай, 1934 г. н., у в. Куты); *«Вадзянік жыве ў вадзе. Абычнае яўленне для ўтопленнікаў»* (зап. ад Г. І. Герасіменка ў в. Неглюбка). Што да знешняга выгляду гэтага персанажа, то сярод мікраматываў пераважаюць наступныя, звязаныя з: антрапаморфным выглядам (*«Вадзянік жывець у вадзе. Стары дзед з доўгай барадою»* – зап. ад А. І. Валасянкінай, 1921 г. н., у в. Палянаўка), адлюстраваннем у іпастасі вадзяніка зааморфных і антрапаморфных элементаў адначасова (вадзяныя *«напамінаюць вялікіх рыб з чалавечым ліцом»* – зап. ад А. А. Азарушкінай у в. Куты; *«Вадзяны выглядае як стары дзед, увесь зялёны, у ціне, а замест нагцей і пальцаў кляшні, як у рака»* – зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня).

Матыў «Дзеянні вадзянога духа ў адносінах да чалавека» выяўляецца ў найбольш распаўсюджаныммікраматыве пра патапленне чалавека вадзяніком: *«Сядзім мы з сяброўкай на беразе ракі, аж бачым, што ідзе маладая пара. Селі яны ў лодку і паплылі на сярэдзіну ракі. Глядзім, аж закруцілася лодка і знікла. А потым з-пад вады мы пачулі дзікі смех, які праз некаторы час сціх. Вядома ж, што ета іх вадзінік зацягнуў»* (зап. ад Надзеі Мікалаеўны Пракопчык, 1934 г. н., у в. Новыя Грамыкі). Матыў, звязаны з засцярогай ад вадзяніка, мае некалькі мікраматываў, але ў веткаўскіх запісах сустракаецца толькі адзін з іх, паводле якога абараніцца ад яго можна пры дапамозе крыжыка і малітвы: *«Нельзя сільна зліць яго, бо тады ўтапіць*

*можа. Каб у жывых астацца, нада ўсігда з сабой крэсцік насіць. Толькі ён зможа спасці чалавека»* (зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня); *«Вадзяны і сам любіць да сябе маладух зацягваць. Таму ніколі не йдзі ў ваду без крыжа, бо ён галоўны выратавальнік»* (зап. ад Н. К. Рослікавай у в. Шэйка).

Сярод персанажаў, якіх у славянскай міфалогіі прынята адносіць да катэгорыі людзей са звышнатуральнымі ўласцівасцямі, вылучаюцца ведзьма, ваўкалак і іншыя. Заслугоўваюць увагі асноўныя матывы міфалагічных тэкстаў пра ваўкалака, запісаныя на Веткаўшчыне: «Ваўкалак (ваўкулак) – чалавек-пярэварацень, які з дапамогай чараўніцтва ператвараецца сам або ператвараецца іншымі ў ваўка на пэўны тэрмін і захоўвае ў воўчым абліччы чалавечы розум» [4, с. 478]. Варта пагадзіцца з высновай даследчыцы А. Я. Леўкіеўскай аб тым, што «ў палескіх тэкстах добра прасочваюцца ўяўленні пра амбівалентную прыроду ваўкалака, які сумяшчае ў сабе чалавечыя і тагасветныя рысы» [4, с. 480]. У адным з міфалагічных тэкстаў, запісаным у горадзе Ветка, можна знайсці пацвярджэнне выказанай думкі. У дадзеным выпадку мае месца апазіцыя «чалавек / нячыстая сіла»: *«Адны гавораць, што ваўкалакі – гэта тыя ж людзі, але ў ваўчынай скуры. Другія расказвалі, што ваўкалакі – гэта нячыстая сіла»* (зап. ад Людмілы Аляксееўны Кузьменка, 1926 г. н.).

Матыў, звязаны з паходжаннем гэтай істоты, адлюстраваны ў выглядзе мікраматываў «Чараўнік ператвараецца ў ваўка» і «Ведзьма магла ператварыць чалавека без яго волі ў ваўкалака»: *«Чараўнік мог ператварацца ў ваўкалака»* (зап. ад М. П. Грамыка у в. Чамярня); *«Была ў нас вядзьмарка адна. Калі хто што зробіць не як яна хоча, дык яна магла ў ваўкалака любога чалавека закалдаваць»* (зап. ад Марыі Лаўрэнаўны Зуевай, 1926 г. н., у в. Стаўбун).

Сярод спосабаў ператварэння чалавека ў ваўкалака, абазначаных даследчыкамі ў выданні, прысвечаным народнай дэманалогіі Палесся [4, с. 483], вылучаецца ў веткаўскіх запісах адметны мікраматыў, зыходзячы з семантыкі якога, патрабуецца наяўнасць трох нажоў, каб жаданне чараўніка стала рэальным: *«…чараўнік мог ператварацца ў ваўкалака пры дапамозе трох нажоў. Гэтыя чараўнікі ўтыкалі нажы ў зямлю, а потым скакалі праз іх тры разы, пасля чаго ператвараліся ў ваўкалакаў»* (зап. ад М. П. Грамыка ў в. Чамярня). У адным з міфалагічных тэкстаўпра ваўкалака мае месца мікраматыў пра ператварэнне ў гэтую істоту пры дапамозе хамута: *«Адзін хлопец ёй (вядзьмарцы) жыта трохі падмяў, дык тая яго праз хамут правяла і ў валкалака закалдавала»* (зап. ад М. Л. Зуевай у в. Стаўбун).

Вяртанне ваўкалакам чалавечага аблічча – адзін з пашыраных матываў мясцовых міфалагічных апавяданняў, што атрымлівае рэалізацыю ў мікраматывах, звязаных з семантыкай стужкі/пояса і асвячэння месцазнаходжання звышнатуральнай істоты (*«Трэба тое месца, дзе часта бывае ваўкалак, пасвяціць вадой з царквы і паміж дрэвамі завязаць ленту белага колеру. Дык вось, ваўкалак будзе бегчы і, калі пераскочыць гэту ленту, то на некалькі хвілін прыме чалавечы выгляд, а тая лентачка адразу стане чырвонай»* – зап. ад Н. К. Рослікавай у в. Шэйка), нажа (*«А потым, калі яны ў такім выглядзе пераробяць усе свае справы, вяртаюцца на тое самае месца і зноў скачуць праз тыя нажы»* – зап. ад М. П. Грамыка у в Чамярня), біцця ваўкалака (*«Казалі, што яго мужыкі 12 разоў палкай секлі, пакуль з яго шкура гэтая воўчая не злезла»* – зап. ад М. Л. Зуевай у в. Стаўбун).

Прааналізаваныя фактычныя матэрыялы па асобных персанажах хатняй і прыроднай прасторы (дамавік і вадзянік), а таксама па істоце (ваўкалак), звязанай з чалавекам, надзеленым звышнатуральнымі ўласцівасцямі, далі магчымасць выявіць групы матываў і мікраматываў, характэрных для міфалагічнай прозы аднаго з палескіх раёнаў – Веткаўскага. Адзначаны найбольш распаўсюджаныя матывы, якія праілюстраваны на матэрыяле мясцовых міфалагічных тэкстаў пра дамавіка, вадзянога духа і ваўкалака.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Толстая, С. М. Свод материалов по полесской народной демонологии / С. М. Толстая // Живая старина. – 2020. – № 4. – С. 58 – 60.

2. Народная демонология Полесья. Публикация текстов в записях 80 – 90-х гг. XX века : в 4 т. / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – 2-е изд. – М. : Издательский дом ЯСК, 2020. – Т. 4. Духи домашнего и природного пространства. Нелокализованные персонажи. – 832 с.

3. Вечнае: фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / аўт.-уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2003. – 362 с.

4. Народная демонология Полесья. Публикации тестов в записях 80 – 90-х гг. XX века : в 4 т. / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – М. : Языки славянских культур, 2010. – Т. 1. Люди со сверхъестественными свойствами. – 648 с.

РЕЗЮМЕ

В статье на основе архивных и опубликованных фактических материалов, записанных в Ветковском районе Гомельской области, рассматриваются основные мотивы и связанные с ними микромотивы, которые нашли отражение в мифологических текстах о некоторых духах домашнего и природного пространства, а также о людях со сверхъестественными свойствами.

SUMMARY

The article deals with archival and factual materials published and recorded in Vetka district, Gomel region. The article examines the main motives and related micro-motives, revealed in mythological texts about some spirits of domestic and natural areas, and people with supernatural properties.

***Раюк А. Р.***

# МЯЖА ПАМІЖ БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ ЭТНІЧНЫМІ ТЭРЫТОРЫЯМІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТ.

*ТАА «БурВодСецъ»*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.3022)*

Адным з нявырашаных і дыскусійных пытанняў беларускай этналогіі з’яўляецца вызначэнне меж беларускай этнічнай тэрыторыі (кампактнага рассялення беларусаў) у канцы XVIII – пачатку XX ст. Складанасці вызначэння і вялікія разыходжанні ў ацэнках датычацца ў першую чаргу мяжы паміж беларускім і рускім этнічнымі масівамі. У дадзеным артыкуле мы разгледзім навуковыя падыходы і ўяўленні этнографаў-сучаснікаў аб тэрытарыяльнай мяжы паміж беларускім і рускім этнасамі ў часе знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі, даныя Усерасійскага перапісу 1897 г., а таксама абгрунтуем і вызначым найбольш рацыянальны падыход у акрэсленні паўночнай і ўсходняй мяжы беларускай этнічнай тэрыторыі ў адзначаны перыяд.

Расійская акадэмія навук пачала першыя этнаграфічныя даследаванні беларускіх губерняў імперыі толькі ў 1820-я гады, звяртаючы ўвагу галоўным чынам на мову насельніцтва і межы рассялення. Сабраныя ў 1827 г. звесткі рускага этнографа П. Кепена не былі надрукаваны. Часткай гэтай інфармацыі скарыстаўся чэшскі славіст П. Шафарык, які ў даследаванні «Славянскі народапіс» (1842) з-за недахопу звестак не змог вызначыць дакладны арэал распаўсюджання беларускай мовы, таму межы этнічнай тэрыторыі беларусаў на ўсходзе, поўдні і паўночным захадзе ён правёў у многім па былых знешніх паўночна-ўсходніх межах Вялікага Княства Літоўскага (напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай), што адпавядалі знешнім паўночным і ўсходнім межам Віцебскай і Магілёўскай губерняў Расійскай імперыі [1, с. 146].

Аднак у Расійскай імперыі да пачатку 1880-х гадоў галоўнай этнавызначальнай прыметай лічылася не мова, а веравызнанне: усіх парафіян